Аляксандр СМОЛІК
доктар культуралогіі
(г. Мінск)

# ІНКУЛЬТУРАЦЫЯ ДЗЯЦЕЙ І ПАДЛЕТКАЎ У ПРАЦЭСЕ ЗАСВАЕННЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ

Спрадвечнай каштоўнасцю, якая не паддаецца сацыяльна-палітычным зменам, уціску, у культуры кожнага грамадства, як і ў сусветнай культуры, з'яўляецца спадчына. Размова ідзе аб культуры ў яе апрадмечанай форме — помніках, малюнках, тэкстах, паданнях і інш. У культурнай спадчыне захоўваецца ўсё тое, што на тым або іншым этапе было створана ў духоўнай культуры народа, нават і тое, што часова было адкінута і раней не выкарыстоўвалася, але пазней можа знаходзіць у грамадстве сваё месца. Пад культурнай спадчынай мы разумеем суму ўсіх культурных дасягненняў дадзенага грамадства, яго гістарычны вопыт, які захоўваецца ў грамадскай памяці. Такая спадчына мае пазачасавую каштоўнасць. Да яе адносяцца дасягненні рознай даўніны, якія пераходзяць да новых пакаленняў, у новыя эпохі. Ад яе старажытных, стагоддзямі назапашаных традыцый шмат у чым залежыць своеасаблівасць духоўнага аблічча нацыянальнай культуры.

Традыцыйная культура ўключае ўсе віды творчай дзейнасці народа (вусную паэзію, музыку, танец, абрады, народны тэатр, рамёствы), якія пераходзяць рознымі шляхамі з пакалення ў пакаленне, захоўваюць асаблівасці сваёй мясцовасці. Традыцыйная культура існуе ў двух відах: першасным — аўтэнтычны фальклор і другасным — апрацаваныя, стылізаваныя, сцэнічныя формы вусна-паэтычнай творчасці. Фальклор — гэта самастойны тып культуры, які мае самадастатковую матэрыяльную і духоўную каштоўнасць. Народнае мастацтва мінулага вылучаецца сваімі цэласнасцю, сінкрэтычнасцю, арганічнай сувяззю з жыццём. З'яўляючыся культурнай спадчынай мінулага, яно застаецца важнай часткай сучаснага культурнага працэсу, нясе магутны культуратворчы патэнцыял, назапашаны за шматвяковы перыяд свайго бытавання. Народная творчасць у розных формах уяўляе невычэрпную крыніцу стварэння мастацкіх каштоўнасцей, з'яўляецца эфектыўнай формай далучэння насельніцтва да працэсу развіцця нацыянальнай культуры.Паколькі фальклор — гэта не музейны або архіўны матэрыял, а жывая культура, таму асноўная мэта сацыяльна-культурных інстытутаў — падтрымліваць гэтае жыццё, надаваць новыя імпульсы існаванню ўсіх відаў аўтэнтычнага фальклору. Важнейшыя задачы ў гэтай сувязі — мэтанакіраваная работа з традыцыяй у культурна-асветных і навучальных установах, адраджэнне забытых або рэдкіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэхналогій народнага рамяства, стварэнне сістэмы пераемнасці фальклорнага і рамесніцкага вопыту, падтрымка носьбітаў і знаўцаў традыцыі, трансляцыя ўзораў і каштоўнасцей фальклору ў мастацкай самадзейнасці і прафесійнай творчасці, іх прапаганда і папулярызацыя.

Нам думаецца, што задачай устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый культуры павінна стаць наладжванне пераемнасці паміж традыцыйнай культурай і сучасным культурным працэсам ва ўсіх яго праявах, разнавіднасцях, формах. У адваротным выпадку для традыцыйнай культуры рэальнай становіцца пагроза паступовага затухання, а для сучасных відаў мастацтва адрыў ад каранёў можа стаць прычынай страты глыбіні і мнагамернасці вынікаў розных формаў творчасці.

У сувязі з гэтым сацыяльна-культурныя інстытуты рэспублікі сталі надаваць шмат увагі праблеме засваення традыцыйнай мастацкай культуры, стварэнню ўмоў для яе самаразвіцця. Гэтае пытанне ўсебакова абмяркоўвалася на выязным пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры ў Лепельскім раёне. Прынята рашэнне аб увядзенні дзесяці спецыяльных прэмій народным майстрам за выдатныя дасягненні і асабісты ўклад у захаванне і развіццё народных традыцый, аб стварэнні базы дадзеных народнай творчасці. Праблемам выжывання традыцыйнай культуры ў сучаснай цывілізацыі была прысвечана VI Еўрапейская канферэнцыя па народнай творчасці (IOV). Тэма "Народная культура ва ўмовах сучасных перамен у розных рэгіёнах Еўропы" зацікавіла вучоных многіх краін свету і дала магчымасць разгледзець актуальныя пытанні існавання і трансфармацыі народнай культуры розных рэгіёнаў Еўропы.

На мяжы стагоддзяў створаны шэраг рэгіянальных мэтавых праграм, скіраваных на падтрымку традыцыйнай культуры. Так, калектывам навукоўцаў рэспублікі па заказу Міністэрства культуры распрацавана праграма "Адраджэнне традыцыйнай мастацкай культуры Палесся" па выніках трохгадовага комплекснага даследавання Усходняга і Заходняга Палесся. З гэтай мэтай праведзены шэраг мерапрыемстваў, у якіх прынялі ўдзел народныя майстры Гомельшчыны, Магілёўшчыны і іншых рэгіёнаў Беларусі. У прыватнасці, гэта:

— рэспубліканская выстава інсітнага (наіўнага) мастацтва, навукова-практычная канферэнцыя;

— першы Міжнародны фестываль фальклору, дзе ўпершыню ва ўсходнеславянскай супольнасці была рэалізавана навукова абгрунтаваная канцэпцыя трохзвённай структуры фальклорнага мастацтва Беларусі: аўтэнтычнага, аматарскага, прафесійнага, праведзены іх раздзельны паказ;

— рэспубліканская выстава народнай творчасці "Вечназялёнае дрэва рамёстваў", якая паказала не толькі сучасныя стан і ступень захаванасці старадаўніх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцый народнага мастацтва, але і ўзровень падрыхтоўкі, арганізацыйнай работы з майстрамі;

— рэспубліканскае свята ганчарства "Ганчарны круг-96" у Бешанковіцкім раёне Віцебскай вобласці, яно было першым "відавым" святам рамяства на ўзроўні рэспублікі і заклала аснову для правядзення падобных "відавых" свят рамёстваў у далейшым;

— абласное свята ганчарства ў Любані "Гліняны звон", якое адбылося па выніках двухгадовай рэгіянальнай праграмы Любанскага раёна па адраджэнні традыцый ганчарства;

— беларуска-польская выстава "Падвойныя дываны са збораў Беларусі і Польшчы", навукова-практычная канферэнцыя "Праблемы адраджэння падвойнага ткацтва на Беларусі". Была разгледжана праграма адраджэння ручнога ўзорыстага ткацтва, распрацаваная Беларускім інстытутам праблем культуры. Праграма грунтуецца на аналізе праблем засваення аўтэнтычных формаў ручнога ткацтва ў культурна-асветных установах, вытворчасці, адукацыі.

Праграму "Беларускі ручнік" можна лічыць прыкладам канкрэтнай мэтавай праграмы асветніцкага характару, якая мае навуковую аснову і плённа рэалізуецца. Па ўсёй рэспубліцы была арганізавана работа па зборы інфармацыі і анкетаванні. У кожнай вобласці, у тым ліку Гомельскай і Магілёўскай, прайшлі выставы ручнікоў, адбыліся рэспубліканская выстава і навукова-практычная канферэнцыя.

Жыццяздольнасць народнай мастацкай культуры, як мы адзначалі, залежыць ад функцыяніравання сістэмы пераемнасці мастацкіх традыцый. У сучасных умовах яна арыентуецца на арганізаваныя калектыўныя і індывідуальныя формы вывучэння, запісу і засваення лепшых узораў народнай творчасці.

Аналіз дзейнасці ўстаноў культуры па захаванні і развіцці мясцовай рукатворнай народнай культуры, у першую чаргу яе традыцыйнай мастацка-этнаграфічнай спадчыны, сведчыць: актыўным збіральніцтвам фальклору, традыцыйных прылад працы, гістарычных звестак па бытаванні рамёстваў, апісанняў традыцыйных тэхналогій, вырабаў народных майстроў займаюцца Дамы рамёстваў. Яны ўзніклі ў пачатку 90-х гадоў і занялі належнае месца ў структуры ўстаноў культуры. У 1992 г. у рэспубліцы існавала 12 Дамоў рамёстваў, у Калінкавіцкім і Горацкім раёнах — цэнтры рамёстваў. У 1997 г. у Гомельскай вобласці налічвалася 20 Дамоў фальклору, цэнтраў і Дамоў народнай творчасці, Дамоў рамёстваў. Акрамя фіксацыі помнікаў народнай спадчыны, Дамы рамёстваў займаюцца наладжваннем актыўнай творчай дзейнасці майстроў, забеспячэннем пераемнасці вопыту народных майстроў моладдзю і падлеткамі. Падлік відаў рамёстваў, якія асвойваюцца ў цэнтрах рамёстваў Магілёўшчыны і Гомельшчыны, дазваляе вылучыць наступныя з іх: традыцыйна развітыя і прадстаўленыя ў большасці вывучаемых раёнаў (ганчарства, ткацтва, вышыўка, разьба па дрэве, пляценне з розных матэрыялаў); унікальныя, якія былі амаль забытыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(падвойнае ткацтва, кавальская справа, роспіс па палатне, ручное пляценне паясоў); рамёствы, у якіх традыцыйная тэхналогія спалучаецца з выкарыстаннем новых матэрыялаў альбо тэхналогія, не характэрная для гэтых рэгіёнаў (чаканка, халодная апрацоўка металу, макрамэ, фрываліто, пляценне з металічнага дроту і інш.); асваенне станкавых формаў прафесійнай мастацкай творчасці і жывапіс, скульптура драўляная і ляпная гліняная.

У Дамах рамёстваў ажыццяўляецца навучанне першасным навыкам ручной працы і асновам рамесніцкай справы. Сярод навучэнцаў і выкладчыкаў ёсць школьнікі, моладзь, інжынерна-тэхнічныя працаўнікі, беспрацоўныя, жанчыны сярэдняга ўзросту. Для некаторых рамесніцкая дзейнасць з'яўляецца нават галоўным сродкам заробку. У гуртках Дамоў рамёстваў існуюць як платныя, так і бясплатныя формы навучання. У якасці выкладчыкаў запрашаюцца альбо спецыялісты, якія маюць прафесійна-тэхнічную ці мастацкую падрыхтоўку, альбо асобы, што авалодалі рамяством самастойна. Але асноўная колькасць кіраўнікоў пакуль што не мае спецыяльнай адукацыі. Спецыфіка вучэбнага працэсу ў Дамах рамёстваў заключаецца ў паглыбленай індывідуальнай працы майстра з кожным навучэнцам. Развіта сістэма асваення рамяства пад кіраўніцтвам мясцовых умельцаў, аўтэнтычных майстроў у сябе дома. Такая форма навучання характэрная для вясковых філіялаў Дамоў рамёстваў.

Даследаванне дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў па перадачы набыткаў фальклорнага мастацтва сведчыць: установы культуры надавалі асаблівую ўвагу спосабам навучання і засваення традыцыі. Гэтага вымагала своеасаблівасць формы існавання традыцыйнай культуры, якая прынцыпова адрозніваецца ад сучаснай культуры пісьмовага тыпу. Этнічная культура з'яўляецца мастацтвам вуснага тыпу, таму і перадача яе набыткаў у асноўным адбываецца вусна. У гэтым кірунку ўжо маюцца цікавыя вопыт і здабыткі. На Гомельшчыне і Магілёўшчыне з'явіліся дзіцячыя калектывы, якія засвойваюць асаблівасці народных спеваў, танец, ігру на музычных інструментах не шляхам навучання, а вусным альбо шляхам імітацыі. З 1992 г. тут пачалі ствараццa школы народнай творчасці, дзе дзеці асвойваюць майстэрства ткацтва, вышыўкі, саломапляцення, разьбы па дрэве, народных спеваў, ігры на гармоніку і інш. Да работы далучаны носьбіты традыцыі, і дзеці набываюць каштоўны вопыт пераймання народнай мастацкай спадчыны "з першых рук". Спеўная, гульнявая, танцавальная, абрадавая часткі праходзяць на прыродзе, і навучанне адбываецца як вусна, так і шляхам імітацыі. І гэта нават не столькі навучанне традыцыі, колькі спроба арганічнага ўваходжання ў яе.

Прыкладам мэтанакіраванай працы з дзецьмі па асваенні традыцыйнага мастацтва можа служыць школа старажытнай і народнай культуры, створаная пры Веткаўскім музеі народнай творчасці. Заняткі ў ёй праходзяць па спецыяльна распрацаванай праграме "Аз, букі, ведзі, глаголь дабро!", якая паэтапна дыферэнцыравана для дзяцей ад 5 да 17 гадоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З 1995 г. пры музеі працуе майстэрня па ткацтве. У Чачэрскім раёне добра наладжана дзейнасць па вывучэнні беларускага народнага танцавальнага этыкету. У гэтым жа раёне адноўлены унікальныя, амаль забытыя беларускія старадаўнія карагоды, карагодныя гульні, полькі, народныя тэатральна-харэаграфічныя прадстаўленні і інш. Праблема засваення нацыянальных, рэгіянальных народных мастацкіх традыцый датычыць не толькі сферы харэаграфіі, але і інструментальнай музыкі, песеннай творчасці.

Важную ролю ў адраджэнні фальклорнай спадчыны адыгрываюць этнаграфічныя гурты і капэлы, калектывы інструментальна-аркестравага і вакальна-харавога жанраў.

Аналіз развіцця фальклорна-этнаграфічных гуртоў у Беларусі паказвае, што абуджэнню цікавасці да нацыянальнай культуры, адраджэнню і развіццю рэгіянальнай харэаграфічнай і музычнай спадчыны садзейнічалі фестывалі. Нягледзячы на аб'ектыўныя складанасці сацыяльна-эканамічнага характару, у апошні перыяд адбылося шмат фестываляў і конкурсаў аматарскай творчасці. Сапраўднай энцыклапедыяй нацыянальнай духоўнай культуры можна назваць першы фестываль беларускага народнага танца "Палескі карагод". Фестываль сабраў аматарскія калектывы, розныя па стылі і ўзросце, з Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай абласцей і Мінска. Гасцямі свята былі творчыя калектывы Літвы, Украіны, Польшчы, Югаславіі, Расіі. Разам з харэаграфічнымі калектывамі ўдзельнічалі гурты народнай музыкі і песні, народныя майстры музычных інструментаў, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. На фестывалі гледачы ўбачылі дзесяткі цікавых мастацкіх праграм, сотні самабытных аўтэнтычных танцаў, мноства балетмайстарскіх пастановак, творчых знаходак, шмат выдатных выканаўцаў.

У рамках рэспубліканскай праграмы адраджэння і захавання нацыянальнай культуры на Гомельшчыне і Магілёўшчыне праводзяцца рэгіянальныя фестывалі фальклорнага танца "Перазовы". Выкананнем танцаў з тымі тонкасцямі і нюансамі, якія характэрныя для пэўных рэгіёнаў, вызначыліся ансамблі народнага танца і музыкі "Лёс" з Чачэрскага раёна, "Душа" Магілёўскага аб'яднання "Крычаўцэменташыфер", "Радуніца" з Мазырскага раёна, "Рунь", "Вянок", "Радасць" з Магілёва, фальклорна-этнаграфічны калектыў в. Янова Веткаўскага раёна і інш.

Традыцыйнымі ў Беларусі сталі агляды народнай творчасці "Грай, гармонік", "Горад майстроў", "Родныя напевы" — свята сямейнай творчасці, "Вялікі дзіцячы карагод", "Беларуская полька" і інш.

Аб тым, што развіццё фальклорнай музыкі ідзе паспяхова, сведчаць фестывалі, якія адбываліся ў іншых рэгіёнах Беларусі. Перыядычна праводзяцца міжнародныя фестывалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклору, абласныя фестывалііі фальклорных калектываў, фестываль народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік", якому нададзены статус міжнароднага; рэспубліканскі фестываль духавой музыкі "Беларускія фанфары»; фестываль "Грай, гармонік", якому быў нададзены статус рэспубліканскага.

У даследуемы перыяд праводзіліся шматлікія мерапрыемствы, фестывалі і святы, удзельнікамі якіх сталі маладыя выканаўцы. У Гомелі праходзіць Міжнародны юнацкі конкурс "Музыка надзеі", у якім прымаюць удзел скрыпачы, піяністы, музыканты духавых аркестаў ва ўзросце да 16 гадоў. Мэта конкурсу – падтрымка дзіцячай творчасці ў раёнах Гомельскай і Магілёўскай абласцей, а таксама Браншчыны і Чарнігаўшчыны, пацярпелых ад чарнобыльскай аварыі. У Бабруйску праходзіць Рэспубліканскі конкурс выканаўцаў на народных інструментах імя І.Жыновіча, на якім юныя выканаўцы на баяне, домры, балалайцы, гітары дэманструюць сваё майстэрства.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ